Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»

# СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ НАЧАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

*Материалы II Международной студенческой научно-практической конференции*

*(в рамках Международного форума «Студенческая наука – инновационный потенциал будущего»)*

*г. Минск, 19 апреля 2018 г.*

*Научное электронное издание локального распространения*

Минск
БГПУ
2018

ISBN 978-985-541-517-7

© Оформление. БГПУ, 2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 373.3
ББК 74.24
С568

Редакционная коллегия:
*Жданович Н. В.* (отв. ред.), кандидат филологических наук, доцент, декан факультета начального образования БГПУ;
*Азарко О. В.*, кандидат филологических наук, доцент, заместитель декана факультета начального образования БГПУ по учебной работе;
*Сорока О. Г.*, кандидат педагогических наук, доцент, заместитель декана факультета начального образования БГПУ по научной работе;
*Василевская Е. С.,* кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры белорусского и русского языкознания БГПУ;
*Качан О. Г.*, кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры белорусского и русского языкознания БГПУ;
*Баранова Л. И.*, кандидат педагогических наук, доцент, доцент кафедры педагогики и психологии начального образования БГПУ

**Современные** тенденции развития начального образования: материалы II Междунар. студ. науч.-теор. конф., г. Минск, 18 апреля
С568 2018 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: Н. В. Жданович (отв. ред.) [и др.]. — Минск : БГПУ, 2018. — 224 с.

ISBN 978-985-541-515-7.

В сборнике представлены результаты исследований студентов, отражающие актуальные вопросы педагогики и психологии начального образования, методик преподавания учебных предметов в начальной школе.

Адресуется преподавателям, аспирантам, студентам и всем, кто интересуется проблемами педагогики, психологии младшего школьного возраста и методик преподавания в начальной школе.

*Минимальные системные требования:*
Операционная система Windows 98 и выше
Процессор Pentium III, RAM 32 Mb (ОЗУ), HDD 250 Mb
Видеоадаптер с разрешением 800×600, 256-цветов,
32 Mb видеопамяти, DVD-ROM, мышь

© Оформление. БГПУ, 2018

*Программное обеспечение:* Adobe Acrobat Reader

Ответственный за выпуск *О. Г. Сорока*
Техническое редактирование и компьютерная верстка *А. А. Покало*
Дизайн обложки *Е. С. Выдрицкой*

Дата подписания к использованию 03.10.18. 2,06 Mb. Тираж 5 электрон. экз. Заказ 621.

*Издатель и полиграфическое исполнение:* учреждение образования «Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка».

Свидетельство о государственной регистрации издателя печатных изданий № 1/236 от 24.03.14.
ЛП № 02330/448 от 18.12.13. Ул. Советская, 18, 220030, Минск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ФОРМЫ РАБОТЫ З ТВОРАМІ НІНЫ ГАЛІНОЎСКАЙ НА ЎРОКАХ ПАЗАКЛАСНАГА ЧЫТАННЯ

# FORMS OF WORK WITH THE WORKS OF NINA GALINOVSKAYA AT THE LESSONS OF EXTRACURRICULAR READING

*А. П. Гамолка*

*A. Hamolka*

БДПУ (Мінск)

Навук. кір. – А.С. Васілеўская, канд. филал. навук, дацэнт

У артыкуле разгледжаны формы працы на ўроках пазакласнага чытання па вывучэнні творчасці Ніны Галіноўскай.

Ключавыя словы: пазакласнае чытанне, вершы Ніны Галіноўскай.

In the article forms of work at lessons of out-of-class reading on studying of creativity of Nina Galinovsky are considered (Google Пераводчик).

Key words: extracurricular reading, verses by Nina Galinovskaya.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Адным з праблемных напрамкаў у сучаснай рэчаіснасці з'яўляецца пытанне аб выхаванні актыўнага чытача, які зможа самастойна выбраць патрэбную кнігу на пэўную тэму, разабрацца і ацаніць яе. Сучасная школа павінна выхаваць падрастаючае пакаленне свядомымі чытачамі, абапіраючыся на творы сучасных пісьменнікаў.

Вялікую ролю ў падрыхтоўцы малодшых школьнікаў па беларускай мове адыгрываюць урокі пазакласнага чытання. Шматлікія беларускія навукоўцы ўнеслі вялікі ўклад у станаўленне і развіццё ўрокаў пазакласнага чытання ў пачатковых класах. А. В. Руцкая, М. П. Осіпава, Н. В. Мельнік, Н. Кубракова, Н. Г. Жук, А. П. Шанько, Т. С. Куцанава, Л. Ф. Кузняцова, і інш. працавалі над удасканаленнем разнастайных аспектаў правядзення пазакласнага чытання ў пачатковай школе.

У дапаможніку Т. С. Куцанавай, В. С. Варапаевай «Пазакласнае чытанне ў пачатковых класах» (1985) акрэсліваюцца мэты, структура, формы, тэматыка пазакласных заняткаў [6, с. 110].

Неабходна адзначыць, што ў часопісах «Пачатковая школа» і «Пачатковае навучанне» падаюцца прыкладныя тэмы пазакласных заняткаў па літаратурным чытанні, урокі, праведзеныя нашымі будучымі калегамі, што, бясспрэчна, з’яўляецца вельмі карыстным для педагогаў, якія адказна працуюць на ўроках пазакласнага чытання. Наша даследванне прысвечана ўрокам пазакласнага чытання па творах паэтэсы Ніны Галіноўскай.

У творчасці для дзяцей Ніна Васільеўна Галіноўская выкарыстоўвае прыёмы міфапаэтычнага мыслення і мастацкія магчымасці розных фальклорных жанраў: пацешкі, казкі, калыханкі, лічылкі, народнага жарту і гульні,

загадкі, скарагаворкі. Яна, глыбока ведаючы жанрава-стылёвую спецыфіку народнай паэзіі, узяла на эстэтычнае ўзбраенне ўсё самае каштоўнае, што ў значнай ступені абумовіла поспех яе твораў для маленькіх чытачоў, і найперш уменне гаварыць проста і даходліва, жартаваць, ствараць эмацыянальную інтрыгу, завастраць дзеянне, выказвацца вобразнай мовай.

У кожным зборніку вершаў Ніны Васільеўны Галіноўскай, а іх усяго дзевяць, размешчаны творы на розныя тэматыкі, і практычна любы з іх падыходзіць для пазакласнага чытання. Гэтыя вершы можна ўключаць для вывучэння пэўных тэм на ўроках пазакласнага чытання.

Пры падрыхтоўцы ўрокаў мы вылучылі наступныя мэты: паглыбіць веды вучняў пра тэматычную і жанравую разнастайнасць твораў Н.В. Галіноўскай, пашырыць чытацкі вопыт навучэнцаў, працягваць працу па фарміраванні станоўчай матывацыі да чытання; удасканальваць уменні самастойнай працы з кнігай, развіваць пазнавальны інтарэс, маўленне, увагу, памяць, мысленне, творчыя здольнасці, выхоўваць павагу да роднай мовы, любоў і павагу да членаў сям'і вучняў.

Пазакласныя заняткі маюць свабодную структуру. У пачатку нашага ўрока па тэме «Мае любімая сям'я» мы выкарысталі ўрывак з верша Ніны Галіноўскай «Песня для мамы». Ва ўступнай гутарцы мы прапанавалі маленькім чытачам паразважаць пра самае каштоўнае, што ў іх ёсць. Усё тое, што яны назвалі, можна назваць шчасцем. У асноўны этап мы пазнаёмілі навучэнцаў з творамі паэтэсы пра сям'ю: «З мамай», «На бліны», «Безбароды дзед», «Дзяжурная», «Працую з дзедам», «Камп'ютаршчык». Падчас гэтага этапа мы правялі міні-конкурс на лепшага чытальніка, а затым загадалі загадкі. Каб іх адгадаць неабходна скласці малюнак з асобных картачак. Пры падвядзенні вынікаў мы ўспаміналі, на якую тэму мы размаўлялі на занятках. Падчас урока мы з дзецьмі змайстравалі сонейка, на кожным промні якога былі напісаны словы, з якіх і складаецца шчасце: сям'я, здароўе, усмешка матулі, добрыя адзнакі і іншыя. Захапленне ў дзетак вызвала тое, што яны самі майстравалі гэта сонейка: не настаўнік выбіраў словы, а яны.

На другім уроку, які адбыўся ў сярэдзіне лютага, мы прапанавалі навучэнцам паразмаўляць пра зімовыя месяцы. На этапе арганізацыйнага моманту мы выкарысталі верш Максіма Багдановіча «Зімой». Далей была выкарыстана прэзентацыя, галоўнай дзеючай асобай у ёй быў снегавік. Разам з ім дзеці адгадвалі загадкі Ніны Галіноўскай пра поры года, апісвалі зіму. Падчас урока дзеці даведаліся новыя звесткі пра кожны зімовы месяц. Найбольш спадабаўся этап рэфлексіі: калі ўрок спадабаўся, то трэба закрыць сняжынкамі снегавіка, а калі ўрок не спадабаўся – закрыць сонейка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Асноўнай формай кіраўніцтва пазакласным чытаннем і навучання чытацкай самастойнасці з'яўляюцца спецыяльныя ўрокі. Урокі пазакласнага чытання выдзяляюцца з вучэбных гадзін, адведзеных на чытанне, уключаюцца ў расклад, фіксуюцца ў класным журнале.

Дапаможныя формы кіраўніцтва пазакласным чытаннем, якія забяспечваюць бесперапыннасць усёй работы і рыхтуюць да ўрокаў пазакласнага чытання, разнастайныя: індывідуальная работа з асобнымі вучнямі ці групамі вучняў, масавыя пазакласныя мерапрыемствы, прапаганда кнігі, сувязь з бібліятэкай, улік прачытанага.

Індывідуальная дапамога і штодзённы кантроль за самастойным чытаннем асобных вучняў – гэта гутаркі з вучнем пра кнігу, абмен думкамі, разгляд і абмеркаванне ілюстрацый, прагляд запісаў вучня аб прачытаных кнігах, наведванне бібліятэкі настаўнікам з вучнем, гутарка з бацькамі пра самастойнае чытанне школьніка.

Вялікае значэнне трэба надаваць прапагандзе кніг. У класе на спецыяльным стэндзе арганізуюцца выстаўкі кніжных навінак ці кніг на пэўную тэму, выстаўкі, прысвечаныя творчасці пісьменніка. Адной з дзейсных форм кіраўніцтва пазакласным чытаннем з'яўляецца сувязь з бібліятэкай [3, с. 39].

Уся дзейнасць настаўніка і вучняў на ўроках пазакласнага чытання па творах Н. Галіноўскай накіравана на фарміраванне кваліфікаванага чытача, які мае патрэбнасць у самастойным чытанні, валодае культурай мыслення, пачуццяў, развітай мовай, навыкамі зносін, уменнямі назіраць, суадносіць, тлумачыць факты і абгрунтоўваць сваё меркаванне.

Важныя паняцці закладваюцца Нінай Галіноўскай у чалавечую душу і свядомасць з ранніх гадоў. Таму неабходна выкарыстоўваць на ўроках пазакласнага чытання не толькі творы ўжо вядомых пісьменнікаў, але і тых, чые імёны нам вядомы не гэтак даўно.

У першую чаргу неабходна ўлічваць, што пазакласная праца праводзіцца для таго, каб замацаваць і паглыбіць той аб'ём ведаў, які вызначаны праграмай, а таксама дапоўніць цікавым, змястоўным матэрыялам, што пашырыць уяўленне пра сумежныя віды мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Літаратура***

1. Жук, Н.Г. Арганізацыя пазакласнага чытання вучняў пачатковай школы / Н. Г. Жук. – Мазыр : Белы вецер, 2008. – 93 с.

2. Зборнік апавяданняў для пазакласнага чытання вучняў пачатковай школы : для мал. шк. узросту / склад. Л. Ф. Кузняцова, Н. У. Антонава. – Мінск : Беларусь, 2011. – 271 с.

3. Крынічка. Хрэстаматыя для дзяцей малодшага школьнага ўзросту / уклад. Р. І. Шастак. – Мінск : «Радыёлаплюс», 2009. – 432 с.

4. Куцанава, Т. С. Пазакласнае чытанне ў пачатковых класах / Т. С. Куцанава, В. С. Варапаева. – Мінск, 1985. – 110 с.

5. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах / пад. рэд. М. Грынько, О. Руцкой. – Мінск, 2010. – 89 с.

6. Пакліч у госці сонца : зборнік твораў для пазакласнага чытання / склад. Л. Ф. Кузняцова, Н. У. Антонава. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2012. – 248 с.

7. Руцкая, А. В. Пазакласная праца па беларускай літаратуры / А. В. Руцкая. – Мінск, 2000. – С. 38-39.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ